Внимательные натуралисты замечали, что на поверхности болота постоянно появляются небольшие пузырьки. Так из-под ила, который размещается на дне экосистемы, выходит болотный газ, накопившийся при гниении мертвых растений под воздействием бактерий и без воздуха. В состав болотного газа в основном входит метан. Он образуется в болоте постоянно: если дернуть по болоту палкой, можно заметить всплывающие пузырьки газа. Метан – это горючий газ: если собрать пузырьки с болота в пробирку и поджечь их, то газ загорится.



Почему мох накапливает воду?

Мох сфагнум (в переводе с греческого – губка) способен накапливать воду в огромных количествах: до 20 раз больше собственного веса! Такое возможно благодаря тому, что стебель и листики мха содержат полые воздухоносные клетки-резервуары. Благодаря "накопителям" сфагнум впитывает воду всей поверхностью и сохраняет ее на протяжении долгого времени. В засушливые периоды мох не погибает, а "засыпает" – входит в состояние анабиоза. Получив достаточное количество влаги, он снова превращается в зеленое "покрывало".



Почему болото засасывает?

Такие болота называются трясинными. Они образуются на месте озер, которые постепенно зарастают растительностью. Болота засасывают только живые объекты, причем маловесные объекты тонуть не будут, в отличие от тяжеловесных. Есть два вида погружения: недопогружение и перепогружение. Тело будет погружаться в трясину до тех пор, пока сила Архимеда не сравняется с его весом. Если выталкивающая сила меньше веса, то произойдет недопогружение объекта, если больше, то перепогружение. Полное засасывание в болото является перепогружением. Если замереть, то это только замедлит процесс, потому что тело все равно дышит (двигается).



Как образуется торф?

Торф – это полезное ископаемое, которое добывают на болотах. Он образуется из не полностью разложившихся остатков болотных растений, мхов и донного ила (сапропеля): они не могут разложиться полностью, потому что не хватает кислорода, а доступ к воздуху блокирует вода. Торф – возобновляемое ископаемое, которое прирастает по 1 мм в год. Содержит 50-60% углерода, поэтому считается важным природным накопителем CO_2. Торф может использоваться как удобрение, топливо. Торфяные почвы – фильтры природной воды: они поглощают тяжелые металлы.



Почему клюква кислая?

На болотах растет вкусная и полезная ягода – клюква. Многие виды растений с кислыми плодами распространяются птицами. В случае с клюквой пернатые поедают ягоды, а те поддаются сложным химическим атакам в пищеварительном тракте птицы. Аскорбиновая кислота защищает семена при переходе в кишечник птицы: она нейтрализует щелочь. Так у семян появляется больше шансов остаться целыми, а затем, пройдя кишечник птицы, взойти. В клюкве содержится большое количество витамина С.



Почему болота светятся?

В теплые темные ночи на болотах можно наблюдать свечение бледно-голубоватых, мерцающих огоньков, которые двигаются по сложной траектории. Это горит фосфористый водород, который образуется при гниении отмерших растительных и животных организмов. При небольшом слое воды в болоте метан выходит на поверхность и загорается от паров жидкого фосфористого водорода. В народных поверьях огоньки называли "свечами покойника", но это был результат химической реакции, и не более того.



Живой комочек снега

В лютую пору в поисках корма повсюду снуют шумные стайки синиц. Среди смешанных групп этих лесных птиц — и всем знакомая большая синица, и небесно-голубая лазоревка, и симпатичная буроголовая гаичка. Если вам посчастливится оказаться на пути такой пестрой стайки, вы без труда заметите среди них и белые пушистые шарики — длиннохвостых синиц.

"Ненастоящая" синица

Эти птицы из отряда воробьинообразных хоть и зовутся синицами, но относятся к отдельному семейству длиннохвостых синиц. Причем в Беларуси, и Березинском заповеднике в том числе, обитает северная цветовая форма этого вида. У нее оперение головы и нижней части тела белое, с розоватым оттенком. Крылья, хвост и спина у птицы черные, глаза сверху окаймляют крохотные розовые "бровки". Эта синица отличается чрезвычайно коротким клювом и длинным ступенчатым хвостом, похожим на узкую ручку кухонной ложки. Именно благодаря своему хвосту очаровательная птичка получила еще одно название — ополовник.

Ополовники населяют в основном окраины лиственных и смешанных лесов, часто обитают вблизи небольших речек и лесных ручьев. В сентябре начинаются массовые осенние перемещения длиннохвостых синиц. В холодное время года они держатся стайками по 8-10 особей. Такими группами кочуют в поисках корма. Перелетая по верхушкам берез, птички звонко переговариваются между собой характерной трелькой. Зимние группы распадаются на пары рано — с первыми оттепелями, еще в феврале. До конца марта большинство птичьих пар занимает свои гнездовые территории.

Искусный строитель

В апреле пары ополовников начинают строить гнезда, что занимает у них долгое время — почти три недели. И удивляться тут нечему: в результате длительного строительства получается настоящий просторный "дворец"! Большое яйцевидное гнездо обычно расположено в развилке ветвей ели или березы. Оно держится в подвешенном состоянии на высоте нескольких метров от земли. Внешние стены жилища искусно сплетены из зеленого мха и коконов насекомых. Строительными материалами также служат кусочки тонкой бересты и лишайников, скрепленные при помощи паутины. Внутри гнездовая камера обильно выложена пухом, перьями и шерстью. В завершение стройки гнезда птицы оставляют сверху узкое летное отверстие.

Заметить ополовников в период гнездования чрезвычайно сложно: они становятся очень скрытными. В конце апреля самка откладывает около двенадцати яиц, которые она насиживает почти две недели. Через положенное время из яиц вылупливаются голые и слепые птенцы. Родители выкармливают малышей в течение 15-17 дней. В этом им иногда помогают и другие взрослые птицы этого вида, возможно, дети предыдущих выводков.

Пернатый санитар леса

Кормятся длиннохвостые синицы лишь мелкими насекомыми, их личинками, а также пауками. Зимой пищей птицам служат яйца, отложенные на ветках травяными блохами и тлями, летом — жуки, веснянки и гусеницы. Многие представители этой беспозвоночной мелочи — вредители деревьев, поэтому ополовника с полным правом можно назвать санитаром леса.

**Анастасия РЫЖКОВА,
младший научный сотрудник
ГПУ "Березинский биосферный заповедник"**

Фото Дениса ИВКОВИЧА




Пано з папяровых ролаў

Сёння мы раскажам, як зрабіць арыгінальнае ўпрыгажэнне, выкарыстаўшы непатрэбныя цыліндрыкі ад туалетнай паперы.





1 Пустыя цыліндрыкі трэба сціснуць, а пасля парэзаць на палоскі.






2 З палосак ствараем кветкі: складваем іх у пялёсткі, а пасля злучаем паміж сабой. Пяць пялёсткаў фарміруюць адну кветку, але можна прыдумаць і іншыя формы.



3 Калі вы зрабілі агульнае пано, размясціўшы кветкі ў выбраным парадку, замацуйце іх клеем. Прышчэпкі спатрэбяцца для таго, каб трымаць кветкі разам, пакуль сохне клей.



5 Усе кветкі склеены і пафарбаваны, засталося толькі скласці іх у агульнае пано з дапамогай клею.



4 Некаторыя кветкі можна пафарбаваць у колеры, якія будуць пасаваць да вашай абстаноўкі ў кватэры.



6 Замацоўваем пано на сцяне цвікамі.

Кветачнае поле з папяровых цыліндрыкаў гатова!

Іншыя варыянты рэцыклінгу папяровых ролаў:

“Заапарк” для гульняў







Гаршчочкі для рассады







Упаковачныя “канверцікі”





АДКРЫВАЛЬНІКАМ НАВАКОЛЬНАГА СВЕТУ



Напрадвесні, акурат на фінішы лютага, свой 50-гадовы юбілей сустракае вядомы беларускі пісьменнік, прызнаны паэт-песеннік, дырэктар выдавецтва "Мастацкая літаратура" Алесь Бадак. Да гэтай важкай даты ў Выдавецкім доме "Звязда" выйшаў ладны том яго твораў для дзяцей малодшага школьнага ўзросту "Як рассмяшыць папугая": аповесці, казкі, апавяданні, вершы.

У анатацыі да выдання гаворыцца: "Творы Алеся Бадака, што ўвайшлі ў гэтую кнігу, прываблiваюць сваёй багатай фантазiяй, тонкай назіральнасцю і светлым гумарам. Яны адрасуюцца не толькі тым юным чытачам, якія любяць займальныя сюжэты, незвычайныя падарожжы ў прыдуманыя краіны, але і кожнаму, хто хоча як мага больш даведацца пра наш навакольны свет, хто любіць прыроду і перакананы: яна не менш дзівосная і таямнічая, чым самы невверагодны казачны сюжэт".

Каб пераканацца ў гэтым, давайце перагарнем некаторыя старонкі новай кнігі. Ну а аўтара павіншуем з высокім юбілеем, пажадаем яму вялікага творчага плёну і моцнага здароўя!

Алесь БАДАК

ПРА БАБРА І ВУЖА

Ціха ноччу. І раптам: ш-ш-у-у-ух! Асіна, што расла каля самай ракі, сваёй зялёнай шапкай у раку ўпала. Гэта Бабёр пастараўся. Робіць плаціну, каб потым каля яе сабе хатку пабудаваць.

— Калі ж ты адпачываеш? — раніцай дзівіцца з Бабра Вуж, вылезшы пагрэцца на сонейка з хмызняку. — І днём, і ноччу ўсё нешта майструеш, завіхаешся!


— Зімой адпачываю, — адказвае Бабёр, адгрызаючы на паваленай асіне галінкі — сваёй сямейцы на абед. — Зімой марозна, рака замярзае — і хацеў бы, не папрацуеш.

— А што, — яшчэ больш дзівіцца Вуж, — калі б зімой было цёпла, як улетку, ды рака не замярзала, ты б і тады працаваў?



— А як жа, — уздыхае Бабёр, — працаваў бы.

Глядзіць Вуж на Бабра і зразумець яго не можа. А Бабёр Вужа-лайдака не можа зразумець.



ТАЯ, ШТО ЛЮБІЦЬ УСІХ

Жабу мала хто любіць. І ў рукі яе не кожны возьме: хто баіцца, а хто кажа, што яму непрыемна гэта рабіць.

Затое Жаба любіць усіх і ўсім захапляецца. Вылезе з вады, зірне на сонца:

— Кла-а-ас!

Захмурыцца неба, а Жаба:

— Кла-а-ас!

Убачыць Страказу:

— Крылы — кла-а-ас!

Сустрэне Камара:

— Нос — кла-а-ас!

Глядзіш на яе і думаеш: "Колькі ж трэба мець у сэрцы любові і дабрыні, каб так усяму радавацца?!"

Падумаеш — і нават крышку за сябе і за ўсіх нас, людзей, перад ёй сорамна стане. Нашы сэрцы большыя, а ці любім мы гэты свет хоць бы так, як яна?

ДЗЕД МАРОЗ

Гэтага чараўніка ведаюць усе. Але больш за ўсіх яго любяць дзеці, бо на Новы год ён заўсёды прыносіць ім падарункі. Ну, вядома ж, я маю на ўвазе Дзеда Мароза. Але не думай, што ён не мае іншых клопатаў. Гэта толькі на Новы год Дзед Мароз прымае чалавечае аблічча ды апранаецца ў тое, што носяць людзі. А так уся вопратка на ім з лёду, снегу ды інею. Працуе Мароз з раніцы да вечара, а то і ноччу: масты на рэках і азёрах кладзе, інеем галінкі дрэў і кустоў беліць, вокны дзіўнымі ўзорамі размалёўвае. А калі стоміцца, часам сядзе на страху, аж вуглы ў хаце патрэскваюць ад такога цяжару.

Як і кожны чараўнік, Мароз любіць, каб яго ўсе слухаліся і пабойваліся. Забудзеш дома рукавіцы — так і ўчэпіцца за пальцы. Забудзеш шапку — за вушы ўхопіцца. Але на яго ніхто асабліва не крыўдзіцца. І гаспадыня, зайшоўшы з вуліцы ў хату, нярэдка весела гаворыць, хукаючы на змерзлыя рукі:

— Ну і марозік сёння!

СОНЯ

Затрапеча
У сінечы
Легкакрылы жаўручок —
Галасочак,
Як званочак
Ці вясновы ручаёк.
Уздыхае
Палявая,
Палявая мышка:
— Мне б званочак-
Ручаёчак,
Хоць на крышку!



Тым званочкам
Я б сыночка
Пабудзіла.

Гэткі соня ён
Сягоння,
Проста дзіва!



ЗИМНИЕ ИГРЫ

Я зимой играть люблю,
Бабу снежную леплю:
Вместо глазок — угольки,
Носик — красная морковка.
У нее в руках — метла,
А на голове — ведерко.
Я леплю и не скучаю,
И друзья мне помогают.
Санки весело скользят,
С горки вниз везут ребят.
Только ветер за спиной,
Снежный вихрь над головой.
А теперь мы лыжи взяли:
Кто быстрее? Побежали!

Как закончится денек,
Мы под вечер — на каток.
На коньках, как будто птицы,
Мы готовы к небу взвиться.
Быстро время пролетело,
Нам играть не надоело.
А теперь — пора нам спать,
Завтра рано всем вставать:
Крепость снежную построим
И зальем ее водою.
Будет новая игра —
Рада снегу детвора!

Татьяна ЧЕКЕД

ЗВЕРИНЫЙ ПАРАД

Что это значит? Что это значит?
Вовочка, мальчик соседский, плачет:
Мама ему не купила игрушку,
Белого зайчика с длинными ушками.

Вовочка, слезки скорее утри,
На небосвод голубой посмотри!
Сколько по небу зверюшек плывет,
Немудрено потерять им и счет.

В панцире жестком ползет черепаха.
Ох, тяжела костяная рубаха!
За черепахой плывет крокодил.
Солнце однажды он проглотил.

За крокодилом топает кот,
Следом — лошадка, лиса, бегемот...
Смотрит на небо восторженно Вовочка:
Стало вдруг зайчиком белое облачко.

С длинными ушками, как в магазине,
Точно таким, как у девочки Зины.
Шествует полный звериный парад.
Вовочка счастлив, Вовочка рад.

Шлет ему зайчик с друзьями привет.
Радости лучшей у Вовочки нет.
Кончен парад: им пора отдыхать,
Чтобы к нам завтра вернуться опять.

Надежда ДМИТРИЕВА



ВЯСТУН ВЯСНЫ

Вястун вясны — крыклівы грак
Расceўся важна на бярозе.
Гукаць вясну — о, ён мастак!
Не змерзлі б лапкі на марозе.

Радзімы кліч важней за ўсё —
У родны кут ляцеў імкліва.
З пяшчоты поўным пачуццём
Вітаецца ён з краем мілым.

І холад будзе, і мароз.
Ды сонца зырка палымнее.
Плыве пяшчота весніх кроз —
Вясны дыханне ўсё сагрэе.

АБЛАЧЫНКІ

Цудоўней люстэрка няма,
Чым гэта вадзіца азёрная.
Глядзіцца сінь неба сама,
А з ёй — аблачынкі чароўныя.

Плывуць і плывуць яны ўдаль,
Вандроўнікі неба вечныя.
Куды плывуць? — не гадай.
Адзін толькі вецер ведае.

Таіса РОЛІЧ

ЛЮТЫ

Дзверы інеем акуты,
І дыміць вушак, як прас.
— А ці добра ты абуты? —
Люты зноў пытае нас.

— Я абуты, як і трэба,
У валёнкі з цеплыні,
Але трэба мне ад неба
Хоць бы трошкі дабрыні,

Бо яно заносіць хаты,
Замятае вочы мне,
Нават санкі-самакаты
Топіць і хавае ў снег.

Нават з шапкі лепіць гурбу,
З рукавічак — ледзяшкі.
Цягнуць дрэвы белым гуртам
Пытлю белага мяшкі.

Плот акуты, дах акуты,
Мерзне ў кузні белы дым...
...Лютага ёсць шмат у лютым,
Ёсць і ласкавае ў ім.

Казімір КАМЕЙША



ПЕРШЫ СНЕГ

Сягоння выпаў першы снег,
Іскрысты і халодны.
Усё наўкола пабяліў
Сваёй рукой лагодна.

Прысыпаў лёгенькім пушком
Азяблыя галінкі.
На хаты стомлена прылёг,
Ухутаўшы ім спінкі.

А для цябе ён шмат прынёс
І гульняў, і забаў.
Хутчэй на вуліцу бяжы,
Пакуль снег не растаў!

Тацццяна ЧЭКЕД

Вядучы старонкі Уладзімір МАЗГО. Малюнкі Алега ПАПОВА

Краявіды малой радзімы

Фота Юрыя ГОРЫДА

Прырода – адно з самых галоўных багаццяў чалавека. Яна вучыць прыгажосці і дабрыні, дапамагае зрабіць першыя ў жыцці адкрыцці і дзеліцца з намі сваімі цікавымі сакрэтамі.

Прыйшоў час паказаць на старонках часопіса ўсё яе хараство! Запрашаем юных чытачоў да ўдзелу ў новым творчым конкурсе, прысвечаным прыродзе роднага краю. Дасылайце свае фотаздымкі, эсэ, апавяданні, малюнкі ў рэдакцыю часопіса "Родная прырода" (220013, г. Мінск, вул. Б.Хмяльніцкага, 10а ці на e-mail: pryroda@zviazda.by). Найлепшыя работы будуць апублікаваны на старонках "Юнага натураліста", а іх аўтары напрыканцы года атрымаюць падарункі ад Выдавецкага дома "Звязда".



Фота Кацярыны УЛАСАВЕЦ



Фота Васіля ЗЯНЬКО

Грамніцы — свята ў гонар Божага агню і свечкі

У аснове структуры традыцыйнага календара беларусаў закладзена падпарадкаванне святкавання асноўных падзей згодна з рухам Сонца па небасхіле. Разам з тым, у гадавым цыкле ёсць святы, прымеркаванасць якіх на сучасным этапе застаецца не да канца зразумелай і патлумачанай. Да такіх каляндарных загадак адносіцца святкаванне Грамніц (царкоўная назва свята — Стрэчанне) 15 лютага.

У самой назве свята чуецца нешта міфічнае, быццам прыхаванае ўшанаванне старажытнаславянскага вярхоўнага бажаства Перуна — уладара жыватворнага агню. Знітаванасць зместу і назвы іншых святаў — Купалле, Масленіца, Багач — яскрава сведчыць пра тое, што свята Грамніцы павінна было атрымаць назву Пяруніцы. Аднак гэтага не адбылося. Мабыць, тут спрацаваў прыродны феномен: задоўга да таго, як Пярун пачне паласаваць неба сваімі сярэбранымі або залатымі стрэламі, чалавек здалёку пачуе папераджальныя грымоты. Гром-Грамаўнік імчаў паперадзе калясніцы Перуна і абвяшчаў людзям: сцеражыцеся, маліцеся, прымайце адпаведныя захады, зрабіце ўсё неабходнае, каб захаваць сваё жытло і сядзібу!



Відаць, менавіта таму славянскія народы з асаблівай пашанай ставіліся да моманту першага грому ў новым годзе. Ён быў своеасаблівым прадказальнікам будучага ўраджаю і, адпаведна, дабрабыту сям'і, а таксама здароўя чалавека. Існавалі прыкметы: "Калі гром грыміць на зялёны лісток, то будзе багаты гадок" і, наадварот, калі гром прагрыміць на "голы" лес — год будзе галодны. Пачуўшы першы гром, чалавек павінен быў выканаць некаторыя рытуальныя дзеянні: стаць спінай да дуба; тройчы перакуліцца праз галаву або проста пакачацца па зямлі, каб не балела спіна.

І гэта далёка не адзінкавы прыклад, калі прырода, наваколле, птушыны свет "прыносілі" чалавеку весткі з будучыні ў своеасаблівай, закадзіраванай, шматзначнай форме. Убачыўшы першы раз маладзік, чалавек прасіў у яго вельмі незвычайнай дапамогі — максімальнага спрыяння фінансаваму становішчу, для гэтага трэба было патрэсці-"пазвінець" манетамі ў кішэні. А хто ж не ведае, што, пачуўшы вясной першы раз кукаванне зязюлі справа, можна спадзявацца на ўдачлівы год, злева — наадварот.

У шматаспектным дыялогу чалавека з прыродай сваё непаўторнае гучанне мелі і Грамніцы — старажытнае свята нашых продкаў у гонар агню. Як дзіця Сонца, агонь меў шмат аблічаў: тая самая калядная зорка і грамнічная свечка, масленічнае або купальскае вогнішча сталі сімваламі прыярытэтаў усёй духоўнай культуры беларусаў. Гэта святло надзеі, спадзяванняў, перасцярогі, знак светласці самой душы і яе памкненняў; нарэшце, гэта радасць самога жыцця, існасці, вызначальная рыса нацыянальнага менталітэту: памятаеце — пакуль на небе гарыць наша зорка, мы жывём на нашай прыгажуні-зямлі. Відаць, зусім невыпадкова пасля ваеннага ліхалецця на беларускай зямлі ўспыхнулі нерукатворныя свечкі — Вечныя Агні, як сімвал памяці, непераможнасці, душэўнай і фізічнай нязгаснасці нашага народа. Глыбінная і ўсёабдымная эстафета памяці: купальская папараць-кветка — казачная Жар-птушка — калядная зорка — грамнічная свечка — і Вечны Агонь.

Былая загадчыца бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Галіна Дашкевіч аднойчы расказала цікавую гісторыю. Улетку яна адпачывала на дачы. Неяк у пятніцу вырашыла з'ездзіць у Мінск. Ідзе да станцыі электрацягнікоў, а насустрач яе суседзі па дачы. Адзін, другі, трэці — і ўсе ў руках нясуць па доўгай лучыне. Пачала пытацца — адкуль і што? Аказалася, на іх дарозе стаяла елка, у якую ўдарыла маланка. Недзе на ўзроўні двух метраў дрэва было зламана і абпалена. Людзі падыходзілі, аддзіралі ад уцалелага камля лучыну і бралі з сабой, каб... захаваць дачны домік ад маланкі і пажару!

Гэты аповед быў настолькі красамоўным і каштоўным у этнаграфічным плане, што прымусіў нас пераглядзець шматлікія пытанні, звязаныя з гісторыяй фарміравання і абрадавым зместам свята Грамніц, блізкароднаснага да яго абраду "Ваджэння і пахавання стралы" і гісторыка-культурнай пераемнасці паміж грамніцай-лучынай і свечкай-грамніцай.

Чаму Грамніцы святкуюць зімой

Нягледзячы на паэтычную прыладжанасць часу святкавання Грамніц у шэраг прыказак і прымавак, сучаснага чалавека ўсё ж здзіўляе, чаму свята ўшанавання Ільі Грамавержца адзначаецца летам (2 жніўня), а яго папярэдніка — уладара нябёсаў Перуна, Грамаўніка — усходнія славяне славяць 15 лютага? Што гэта — парадокс, часавы алагізм або вынік жорсткага націску хрысціянскай традыцыі?



Пакуль што зразумела толькі адно: сучасная дата святкавання Грамніц напрыканцы зімы — з'ява вельмі позняя і цалкам суадносіцца з хрысціянскай традыцыяй, якая, у сваю чаргу, абапіраецца на традыцыю старажытных іўдзеяў прыносіць немаўля ў храм на саракавы дзень пасля нараджэння. Тое ж самае тычылася і маці-парадзіхі: толькі праз сорак дзён яна атрымлівала права прайсці абрад ачышчэння і далучэння да царквы. Ад Раства Хрыстовага да Стрэчання (руская царкоўнаславянская назва Сретенье) якраз роўна 40 дзён.

У разуменні хрысціянскіх багасловаў Стрэчанне адзначаецца як свята сустрэчы старазапаветнай і новазапаветнай традыцый і веравызнанняў. На зямлю прыйшоў Агнец Божы для выратавання чалавецтва ад першароднага грахоўнага падзення. Стрэчанне — гэта сімвалічная перадача духоўнай эстафеты ад апошніх прадстаўнікоў дахрысціянскага свету Творцу новага свету, у асобе якога ўжо суіснавалі два пачаткі — Боскі і Чалавечы.

У народным асяроддзі гэта знакамітая і лёсавызначальная падзея была асэнсавана па-свойму, атрымала дадатковае адценне і стала ўспрымацца як прыроднакасмічнае "Стрэчанне" — сустрэча зімы з вясною. Захавалася народная песня, якая якраз і падкрэслівае адметнасць падзеі святочнага дня:

А ў нас сёння Стрэчанне, Стрэчанне,
Зіма з летам сустрэлася, сустрэлася.
Лета зіму піхнула, піхнула,
І ножачку звіхнула, звіхнула.
Зіма пайшла плачучы, плачучы,
Лета пайшло скачучы, скачучы.

Што ж магло адбывацца раней, у які час Грамніцы адзначаліся ў дахрысціянскую эпоху? Пераважная большасць сучасных даследчыкаў традыцыйнага календара беларусаў акцэнтуе ўвагу на земляробчым характары свята. Строга кажучы, гэта не зусім дакладна, таму што ў нашай геаграфічнай паласе актыўная праца на зямлі доўжылася не больш за пяць месяцаў. Ды і сярод святаў майска-вераснёўскага перыяду не ўсе мелі ў якасці вызначальнай земляробчую накіраванасць. Гэта і дае нам падставы сцвярджаць, што каляндар беларусаў, як і іншых народаў свету, быў хparty ханалагічнай матрыцай ушанавання багоў, якія “курыравалі” адпаведную сферу жыццядзейнасці соцыума (вясковай абшчыны, племені, асобнага роду). На больш познім этапе, калі распачаўся працэс дэміфалагізацыі архаічнай сістэмы светапоглядных уяўленняў, адбылася прынцыповая рэструктурызацыя календара і пераасэнсаванне сістэмы сацыякультурных каштоўнасцей. Ад міфалагічнай сістэмы захавалася пашана да двух нябесных “метраномаў” — Сонца і Месяца, месца багоў занялі ўяўленні аб актыўным і пастаянным дыялогу з душамі продкаў. І толькі трэцім складнікам стала сістэма вераванняў, звязаная з земляробствам і жывёлагадоўляй. Безумоўна, самым вызначальным крытэрыем упарадкавання быў і застаўся дыялог з Космасам, у якім не апошняе месца належала ўтаймаванню прыродных стыхій, перш за ўсё Грому, Маланкі, Перуна і Граду.

Калі разглядаць святы, падчас якіх выконваюць рытуальныя дзеянні ў гонар Грому, Маланкі і Перуна, то можна заўважыць цікавую трыяду: Грамніцы — “Ваджэнне і Пахаванне стралы” і свята ў гонар Ільі-Грамавержца.

Такім чынам, атрымліваецца выразны малюнак каляндарнага ўшанавання самай разбуральнай прыроднай стыхіі. Звесткі, якія дайшлі да нас у запісах збіральнікаў этнафальклорнай спадчыны, сведчаць пра тое, што знакавай пазіцыяй у веснавым колабегу часу быў першы гром. Але паколькі гэтая з’ява мела лакальны характар і розначасовую прымеркаванасць, то ёй спадарожнічалі індывідуальныя рытуальныя дзеянні. Аднак, думаецца, усё ж у беларусаў было агульнарадавое, абшчыннае свята веснавога ўшанавання Грому-Перуна.

Паказальным у гэтым сэнсе, безумоўна, з’яўляецца абрад “Страла”, які лакалізаваўся ў паўднёва-ўсходняй частцы Усходняга Палесся з эпіцэнтрам у Веткаўскім раёне і выконваецца на саракавы дзень пасля Вялікадня — на Ушэсце. Гэты рытуальна-абрадавы комплекс мае ўсе неабходныя складнікі, якія звязаны з культам Перуна і пазнейшым хрысціянскім напластаваннем. Жанчыны-ахоўніцы Роду і захавальніцы хатняга ачага, узяўшыся за рукі, дакладней — пераплёўшы іх у “вяроўку”, “выводзілі” “Стралу-маланку” за вёску. На ўскрайку жытнёвага поля яны “хавалі” бліскавіцу. Сёння яе займеннікам выступае пучок жытнёвых каласоў, манета, любы бліскучы прадмет і г.д. А што магло быць раней, у сівой даўніне? У в. Казацкія Балсуны і Пералёўка абрад распачынаецца ваджэннем карагодаў вакол бярозы, якая расце на скрыжаванні вуліц у цэнтры вёскі. Але некалі ролю рытуальнага цэнтра, ядра абрадавага дзеяння выконвала дрэва, у якое ўдарыў Пярун. Замкнуўшы гэта дрэва ў сімвалічнае кола, жанчыны вадзілі карагоды, спявалі гімны ў гонар вярхоўнага бога славянскага пантэона. А затым кожны з удзельнікаў адломваў сабе “грамнічную стралу” (шчэпку або лучыну), і хутчэй за ўсё не адну, “пахаваннем” якой і заканчваўся незвычайны абрад. А яшчэ адну стралу-лучыну людзі неслі дадому, дзе і выкарыстоўвалі ў шэрагу аказіянальных рытуалаў.

З прыходам хрысціянства ролю “стралы” пачала выконваць свечка, якая заняла ключавое месца ў пачатковай фазе святкавання Ушэсця і “Ваджэння стралы”, а месцам яе асвячэння стаў храм. Заслугоўвае ўвагі і той факт, што ў абрадзе Грамніц, апісаным вядомым этнографам М.Я. Нікіфароўскім, свечкі, прынесеныя людзьмі ў царкву, складвалі ў адно месца (быццам у адзінае “дрэва”, якое пасля асвячэння трэба было падзяліць на “свечкі-лучыны”), праводзілі спецыяльны абрад саборнага паяднання, абшчыннай узаемаспалучанасці, пасля якога грамніца надзялялася статусам касмічнай або Боскай пазначанасці, набывала функцыі абярэга, амулета, талісмана.

Аксана КАТОВІЧ
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА



Сакавік жыцця



У пухавіцкай вёсцы Навасёлкі ў 1920-я родныя краявіды замалёўваў таленавіты мастак Аркадзь Астаповіч

Ён — з пакалення творцаў, у лёсе якіх відавочнымі з'яўляюцца трагедыя, драматызм, уласцівыя іх часу. Каля 300 твораў Аркадзя Астаповіча, якія захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, адлюстроўваюць і час з усімі яго перыпетыямі, і ўсю велічыню таленту легендарнага творцы.


Уваходжанне Аркадзя Астаповіча ў гісторыю беларускага мастацтва як з'явы адкрытай, відавочнай пачалося параўнальна нядаўна. Толькі ў 1960-я гады, праз два дзесяцігоддзі пасля смерці мастака, адбылася яго першая персанальная выстаўка. З'явіліся кнігі, у якіх быў дадзены грунтоўны аналіз яго творчасці. А нядаўна ў мінскім выдавецтве "Беларусь" у серыі "Славутыя мастакі з Беларусі" пабачыў свет альбом "Аркадзь Астаповіч". Аўтар тэксту і складальнік — мастацтвазнаўца Надзея Усава.

Частка жыцця Аркадзя Астаповіча прайшла на Пухавіччыне (1923-1929). Да гэтага часу мастак ужо меў адукацыю, пэўны творчы вопыт. Яшчэ ў 1915 годзе ў Пецярбургу наведваў Малявальную школу Імператарскага таварыства заахвочвання мастацтваў, якой кіраваў Мікалай Рэрых. Настаўнікамі былі вядомыя рускія графікі — І. Білібін, П. Навумаў, А. Эберлінг. У сярэдзіне 1922 года пасля дэмабілізацыі з Чырвонай Арміі Аркадзь Астаповіч вярнуўся на радзіму бацькі. У Навасёлках мастак уладкоўваецца на працу настаўнікам матэматыкі, чарчэння і малявання ў сямігадовую працоўную школу.

Чытаем у Надзеі Усавай пра навасёлкаўскі перыяд Аркадзя Астаповіча: "У гэтай беларускай вёсцы адбыўся раптоўны рывок, нечаканы "скачок якасці" яго графічных твораў, нараджэнне Астаповіча як самастойнага мастака. Навасёлкаўскі перыяд, гэта шчаслівае сяміподдзе, прынята лічыць лепшым у творчасці мастака. Навасёлкі сталі ціхай гаванню пасля гадоў вайны і блуканняў, другой пасля Петраграда светлай паласой яго жыцця. Шчаслівы шлюб са сваёй стрыечнай сястрой Нінай Якубовіч, удзел амаль ва ўсіх Усебеларускіх выстаўках, першае прызнанне, натхнёнае асваенне новай тэхнікі — лінарыта, нараджэнне сына-першынца — гэта зліццё асабістага шчасця і творчых поспехаў амаль нічым не азмрочана..."




Вуліца. 1928 г.


Зіма. 1927 г.

У альбоме да “навасёлкаўскага перыяду” нас адрасуюць наступныя работы: “Ля ракі”, “Маладзік”, “Заводскія карпусы”, “Палёт”, “Драпежнік”, “У заапарку”, “Чаплі”, “Бяскрыл”, “Вулей”, “Зімовы пейзаж”, “З дровамі”, “Вёска”, “Куток двара”, “Вуліца”, “Вёска (Вясна)”, “Калодзеж”, “Сакавік”, “Ранняя вясна”... Кожная з работ ўражвае, прымушае ўзнаўляць у памяці сапраўды навасёлкаўскія пейзажы. І разам з тым перад намі зусім не этнаграфічныя замалёўкі. Углядаючыся ў зімовую вёску, ідучы за мастаком па Навасёлках, увесну ці летам, ловіш сябе на думцы, што творца выклаў усведамленне вясковага жыцця за ўсё мінулае стагоддзе. Аркадзь Астаповіч перадаў нам свой мастацкі запавет, сказаў нашмат больш, чым бачым мы зрокава на яго работах. Душа і сэрца ўглядаюцца ў большую сутнасць. Вядома, дапамагаюць сюжэт, колеры, але фарбы, краскі, здаецца, празорлівы погляд Аркадзя Астаповіча вядуць далей, углыб.


Надзея Усава выразна акрэслівае “пухавіцкую” прастору мастака: “Трапіўшы ў Навасёлкі, Астаповіч апынуўся ў незнаёмым яму асяроддзі. Мастак не жыў у вёсцы ніколі, але, вядома, бываў там. Ён быў прыроджаны гараджанін, хаця і са сваім, крыху змрочным, успрыманнем горада. Здаецца, сялянская культура мусіла быць яму далёкай, гэтак жа як і ён, заняты сваёй “несур’ёзнай” справай — мастацтвам, — сялянам. Але так не сталася: сяляне паставіліся да мастака з павагаю, і ён з цікавасцю ўглядаўся ў твары сваіх вучняўпадлеткаў (альбом 1925 года), вывучаў сялянскі побыт (“Асярод”), нялёгкую жаночую працу (“Мыццё бялізны”, 1927). Усё гэта было бясконца далёкім ад таго, што ён рабіў раней. Арнаменталізацыя прыроднага матыву паступова саступіла месца непасрэдным ураджанням. Мадэрновы каркас яго творчасці пахіснуўся пад націскам натуры. Змяніўся, нават знешне, і сам мастак: прыезджы былы вайсковец-гараджанін загарэў, абветрыўся і пераўтварыўся ў вясковага настаўніка-інтэлігента, якога сяляне прывыклі бачыць з эцюднікам і фотаапаратам...”

Навасёлкі дапамаглі напоўніцу разгарнуцца таленту Аркадзя Астаповіча. Але ж, зразумела, гэта не адбылося б без багатай, насычанай адкрыццямі ўнутранай духоўнай работы. Усё спрыяла развіццю: і сям’я, і сама вёска, прырода ў ваколіцах Навасёлак, Мар’інай Горкі, маленькая і ўсё ж шырокая, раздольная, вірлівая рака Цітаўка.

Знаёмства з альбомам “Аркадзь Астаповіч” — някідкім па сваім аб’ёме, невялікім па памеры, але нейкім цёплым і сімпатычным, — падштурхоўвае да наступных разваг. Прывязанасць мастака да выкладання ў сваёй творчасці блізкіх яму пухавіцкіх Навасёлак патрабуе звароту, увагі да гэтай мясцовасці. Чаму б у Навасёлках не наладзіць мастацкі пленэр? Добра было б запрасіць у гэтыя мясціны на новае мастацкае, мастакоўскае прачытанне Навасёлак і ваколіц творчую моладзь. Дарэчы, на будынку былой школы ў вёсцы была ўсталявана мемарыяльная дошка, якая нагадвае, што ў гэтых мясцінах жыў і працаваў мастак Аркадзь Астаповіч. Ды прадалі гэты будынак прыватнікам. А тым да мемарыялізацыі справы ніякай. Цяпер дошка знаходзіцца ў запасніках раённага краязнаўчага музея.

А ўсё ж ідэя з пленэрам добрая. Чаму б яе не ажыццявіць? Чаму б мастакам новага пакалення не агледзець родныя краявіды, не прайсціся ваколіцамі Навасёлак?..

Міхась ВУГАЛЕЦ
Фота Наталлі АСМОЛЫ


Чаплі. 1926 г.


Куток двара. 1925 г.

"Квартирный вопрос" для водных обитателей

Аквариум — это не просто емкость с водой, рыбами и растениями, а целый мир, для создания и существования которого требуются определенные знания. Чтобы правильно подобрать аквариум для квартиры или офиса нужно иметь представление, на какие группы они делятся. Лучше ознакомиться с этим вопросом заранее, так как в зоомагазине глаза разбегаются от обилия различных вариантов.



Сформировать красивый аквариум с множеством рыб различных видов, которые порой живут в противоположных концах земного шара, — это возможность создать свой, неповторимый, подводный мир. Но часто разница в условиях обитания, параметрах водной среды, пищевых предпочтениях, поведенческих характеристиках и, конечно же, размерах делают рыб несовместимыми.

При покупке или изготовлении аквариума профессионалы делают упор на оптимальные условия содержания и разведения подводной флоры и фауны. Как правило, сначала специалисты определяют, какой вид будет преобладать — рыбы, ракообразные или моллюски, — в каком количестве и насколько они совместимы. И только после этого выбираются объем и геометрия. Любители же выбирают аквариум как элемент декора. Здесь на первый план выступает гармония с интерьером.

Итак, какие аквариумы бывают в зависимости от формы?

- **Угловые аквариумы** хороши для заполнения и оживления углового пространства в помещении. Такие аквариумы удобны в офисах, холлах общественных заведений. Кроме того, за счет большой глубины и ширины стеклянной части эта форма позволит дизайнеру организовать фантастическую подводную гавань или голубую лагуну.
- К **настенным аквариумам** профессионалы относятся настороженно, ведь такие емкости узкие, а значит за ними сложно ухаживать, они имеют большой вес и требуют надежного крепления. Эти "живые картины" подходят для содержания не многих видов рыб.

На практике у меня был лишь один подобный аквариум, там содержались карликовые лягушки гименохирусы.

■ **Панорамные аквариумы.** Главным отличием подобного типа аквариумов является изогнутое переднее стекло. Панорамный аквариум может быть прямоугольным, угловым, круглой или овальной формы. Здесь присутствует эффект "увеличительного стекла". С одной стороны, это позволяет разглядеть каждую чешуйку подплывающих к стенке рыбок, что очень впечатляет, с другой стороны, оценить реальные размеры гидробионтов зачастую не удается. К тому же следует учитывать, что при некачественных стеклах искажаются не только силуэты животных, но и предметы декора.

■ **Прямоугольные аквариумы** — классические аквариумы. Они идеальны по всем характеристикам. Если соблюдается правило: ширина резервуара равна его высоте, то он подходит для содержания любых видов рыб. При таких пропорциях вода лучше всего насыщается кислородом, в нем много места для свободного передвижения водных жителей. Здесь можно создать любой подводный ландшафт. Дополнительным плюсом классического аквариума является оптимальное соотношение цены и функциональности.

Как показывает многолетняя практика, чем больше аквариум, тем легче за ним ухаживать.

Классификация аквариумов с биологической точки зрения строится исходя из биохимических и биофизических параметров воды, по тому, кого планируется заселять, функциональному назначению и другим характеристикам.

● **По химическому составу воды** бывают пресноводные и морские (переходный вариант — солоноватоводные) аквариумы;

● **по требованию живых организмов к температурному режиму** — тепловодные или холодноводные;

● **по составу гидробионтов** — общий аквариум (тип общежития для различных видов рыб из разных мест обитания), коллекционные (созданные с учетом выбора конкретных семейств и родов рыб или растений, но из различных регионов планеты), биотопные (подбор рыб и растений производится по географическому принципу);

● **по функциональному назначению** — нерестовые (для разведения), выростные (для подращивания мальков и беспозвоночных животных), карантинные (для временного содержания рыб или растений после покупки во избежание эпидемии в основном аквариуме), культиваторные (например, для разведения кормовой культуры), вспомогательные (применяются для фильтрации воды, идущей по кругу из основного аквариума за счет культивируемых в таких аквариумах растений и микроорганизмов), травники (для выращивания растений);

● **по величине столба воды** — глубоководные (как правило, это узкие и высокие аквариумы) и мелководные (низкие аквариумы с большой площадью дна);

● **по объему емкости** — маленькие, или малолитражные (до 60 литров), средние (до 200 литров), большие (от 200 литров).

Разумеется, такое деление аквариумов условно. Важно понимать, что достичь аквариумной эстетики без соблюдения правил содержания рыб, беспозвоночных или растений, светового режима и качества фильтрации воды невозможно. Ведь при нарушении биологического равновесия вода в аквариуме портится: меняются ее физико-химические параметры, она мутнеет, начинает "цвести" и приобретает неприятный запах. Зачастую причина этих пагубных последствий — ошибки, допущенные еще на этапе выбора аквариума. Чтобы их избежать, следует ответственно подходить к подбору всех элементов: стеклянного резервуара, подставки, крышки с осветительными приборами, компрессора, фильтра, терморегулятора, элементов декора.

Евгений ДЕДКОВ

Виды аквариумов





Многія думаюць, што жывёлам не ўласцівыя пачуцці і эмоцыі. Дружба, самаадданасць, клопат, любоў, здрада — гэтыя якасці мы лічым выключна чалавечымі. Але ці так гэта?



Зверскае каханне

Пакуль смерць не разлучыць нас

Жывёльны свет разнастайны ва ўсіх сваіх праявах, пачынаючы ад унікальных формаў і мноства афарбовак і заканчваючы асаблівасцямі паводзін асобных відаў. У тым ліку і ў каханні. Не будзем удавацца ў навуковыя дыскусіі і прыклады, не будзем рабіць акцэнт на адхіленні ад нашага звычайнага разумення рамантычных сувязяў паміж прадстаўнікамі палоў, якія традыцыйна лічацца ў нас прыгожымі і моцнымі. Хаця сярод жывёл ёсць безліч прыкладаў, калі жаночы пол слабым не назавеш. Дастаткова ўспомніць арлоў, самкі якіх маюць большыя памеры за самцоў і здабываюць ежу для птушанят; або самак багамолаў, якія з'ядаюць галовы самцоў падчас размнажэння; або многіх павукоў, напрыклад надзвычай атрутных чорных удоў, якія нездарма атрымалі сваю назву. Самцу пасля такой "рамантычнай" сустрэчы з доўгачаканай сяброўкай, як правіла, даводзіцца несалодка. Не дзіва, што ў шматлікіх відаў з такімі адносінамі паміж паламі самцы ў некалькі, часам у дзясяткі разоў драбнейшыя за самак. Хто ў гэтым выпадку слабы пол?



Аднак не будзем пра сумнае, у прыродзе ёсць прыклады рамантычных заляцанняў самцоў да самак. Напрыклад, некаторыя віды павукоў вельмі пацешна танцуюць у гэты перыяд. У нас гэта выклікае толькі ўсмешку: падрыгванні канечнасцямі, прысяданні, прыпаданні на той ці іншы бок — хіба гэта танец? А самкам-павучыхам падабаецца. Уласна на гэта і разлічвае хітры самец. Танцуючы, ён уводзіць самку ў стан своеасаблівага трансу, што істотна павялічвае яго шансы на выжыванне пасля спаткання. Я сам нярэдка назіраў карціну, калі самец павука-птушкаеда пасля такіх заляцанняў, уцякаючы ад самкі, якая прыходзіць у сябе, рабіў неверагодныя скачкі, літаральна вылятаў з даволі глыбокага кантэйнера.

Танцуюць перад самкамі і самцы скарпіёнаў. Падскокваючы і хістаючыся з боку ў бок, самец ходзіць вакол самкі, затым ён сваімі клюшнямі бярэ клюшні самкі, і разам яны так могуць хадзіць шматлікія гадзіны, а часам і суткі. Збоку ўсё выглядае даволі рамантычна. Аднак асноўная задача самца ў гэты момант — утрымаць самку ад нападзення.

Танцуй пакуль малады

Танцы сярод жывёл — вельмі распаўсюджаны прыклад заляцанняў. Нельга без захаплення глядзець на рытуалы баталёнаў і райскіх птушак, дробных рыбак, страката афарбаваныя самцы якіх выконваюць мудрагелістыя піруэты вакол сваіх выбранніц. Паглядзіце на павольныя прытупванні самцоў і самак блакітнаногіх олушаў, якія хістаюцца з боку ў бок; ці закаханых пінгвінаў Адэлі, якія глядзяць уверх, альбо велічных імператарскіх пінгвінаў, якія пакорліва схілілі галовы.

Лебядзіныя танцы наогул сталі легендай. Вялікімі рамантыкамі з'яўляюцца сланы, якія пераплятаюць хобаты і падоўгу так стаяць, уткнуўшыся адно ў аднаго лбамі. Час ад часу самец зрывае для сваёй выбранніцы самую смачную кветку альбо галінку. Не пазбаўлены пачуццяў і такія водныя гіганты, як кіты. Пара доўга плыве побач, перыядычна паляпваючы плаўнікамі адно аднаго. Абняўшыся хвастамі, плаваюць закаханыя марскія канькі.





У арсенале заляцанняў у жывёл ёсць і такі рытуал, як спевы. Часам мы нават уявіць не можам, што скрыпы, шыпенні, пстрыканне — гэта і ёсць яны, і такія спевы дораць радасць выбранніцы.

Нярэдка самцы спяваюць не для нейкай канкрэтнай самкі, а ў прынцыпе прыцягваюць да сябе ўвагу. Успомніце серэнады жаб на захадзе або выдатныя пералівы салаўёў раніцай — усё гэта прыклады такога роду паводзін. Сюды ж можна аднесці ціхае парыпванне вадзянога скарпіёна, якое ён выдае пры дапамозе дыхальнай трубкі, цурчанне, а часам і надзвычай гучны спеў цвыркуноў, якія выдаюцца пры дапамозе крылаў, што труцца адно аб адно.

Я падару табе… муху

Нельга абысці і тэму падарункаў. Арыгінальныя падарункі робяць самцы некаторых відаў павукоў. Яны падаюць самкам загорнутую ў павуцінне муху. Пакуль самка занятая падарункам, ён выконвае свае функцыі, якія забяспечваюць выжыванне віду, і імкнецца як мага хутчэй пакінуць арэну падзей. Яшчэ хутчэй спрабуюць уцячы самцы, якія дораць самкам "тандэт": замест мухі ў павуціне загорнутая, напрыклад, трэска альбо нешта аналагічнае.

А вось самцы пінгвінаў Адэлі дораць сваёй выбранніцы каменьчык, які потым выкарыстоўваюць пры будаўніцтве гнязда, ну, зразумела, калі выбар упадзе на яго. Так бы мовіць, першы камень у падмурак сямейнага дома.

У прыродзе ёсць і складаныя шлюбныя рытуалы, у якіх самцы ладзяць паказальныя, а часам і самыя сапраўдныя баі. Дастаткова ўспомніць высакародных аленяў, глушцовы і цецеруковы ток. Такія рытуалы характэрныя для вялікай колькасці відаў жывёл.

Вельмі ўражліва выглядаюць масавыя танцы фламінга, калі дзясяткі птушак збіраюцца разам і, падскокваючы, круцяцца, спрабуючы прыцягнуць увагу свайго патэнцыйнага партнёра. Перад гэтым свае пёркі старанна вымазваюць асаблівым тлустым рэчывам, што надае птушцы яшчэ больш яркую афарбоўку.

Пагадзіцеся, як гэта ўсё нагадвае нашы традыцыі. Складана знайсці прынцыповую розніцу паміж дзеяннямі братоў нашых меншых і чалавечымі рыцарскімі турнірамі, балямі, дыскатэкамі і актыўнымі да іх падрыхтоўкамі.

Алег БАРАДЗІН,
кандыдат біялагічных навук



Інвентар
для адкачвання мёду і распячатвання сотаў

Самым складаным перыядам у дзейнасці пчаляра з’яўляецца перыяд адкачвання мёду. Гэтая працэдура праводзіцца пасля назапашвання мёду ў магазінных надстаўках альбо карпусах (прыпадае на май—верасень).

Найбольш цяжка адкачванне мёду праходзіць у канцы жніўня, таму што за кароткі тэрмін неабходна правесці іншыя работы: скараціць аб’ём гнязда, апрацаваць пчол ад вараатозу, падкарміць іх на зіму. Аптымальна скончыць адкачванне да канца верасня. Гэта задача не з простых, таму для яе вырашэння пчаляр павінен альбо наняць на пчальнік дадатковых работнікаў, альбо як мага больш механізаваць працу. Для павышэння прадукцыйнасці працы пчаляры-прафесіяналы выкарыстоўваюць сучаснае абсталяванне і інвентар. Вось пералік абсталявання і інвентару для адкачвання.

Стол для распячатвання сотаў — гэта пасудзіна, над якой распячатваюцца сотарамкі (здымаецца пячатка з сотаў) і захоўваюцца да моманту пастаноўкі іх у медагонку. У сучасных сталах мёд, які выцякае з рамак, яшчэ і фільтруецца, г.зн. аддзяляецца ад пячаткі (забруса). Для поўнага аддзялення воскасыравіны ад мёду са стала можна дадаткова адкруціць яго на цэнтрыфузе. Дзякуючы выкарыстанню стала, павышаецца прадукцыйнасць працы, а мёд не губляецца.


Стол для распячатвання сотаў.

Сталы заўсёды вырабляюцца з нержавеючай сталі. Памеры могуць быць розныя: ад 10 рамак і болей, аптымальны — на 20-25 рамак.

Медагонка — абсталяванне, якое дзякуючы цэнтрабежнай сіле


Медагонка.


Паравы нож для распячатвання сотаў.

аддзяляе мёд з сотарамак. Пасля распячатвання сотарамка ставіцца ў касету (альбо гняздо) медагонкі і круціцца. Ствараецца цэнтрабежная сіла, і мёд вылятае на сценкі медагонкі. Пасля адкачвання соты зноў могуць выкарыстоўвацца для складзіравання мёду пчоламі.

Медагонкі бываюць розных памераў, як па аб’ёме, так і па колькасці рамак. Чым большы дыяметр медагонкі, тым больш можа змясціцца рамак, тым лепш адкачваецца мёд і менш траўміруюцца соты.

